ВИТЕБСКИЙ Курьер

Издатель - ООО «Издательский дом «Зубр»

Газета издавалась с 1906 по 1913 год, возобновлена 9 июня 1990 года

№10 (10) четверг, 17 декабря 2009 года

Цена – свободная

Выходит еженедельно

КНЯЗЬ АЛЕКСАНДР С СЫНОМ

стр. 3

ЗМИЙ ЖИВЁТ НА УЛИЦЕ ЛЕНИНА

стр. 5

НАС ПРОДАЛИ АВТОПРОМУ РОССИИ

стр. 9

Вокруг ёлки

На центральной площади Витебска уже ставят самую главную зелёную красавицу города

Большая витебская ёлка
ФОТО: АВТОРА

Центральная новогодняя ёлка Витебска установлена в этом году на обновленной площади Победы. Вокруг нее пока гуляют сквозняки да кошки, предчувствующие приближение года Тигра.

Но с каждым днем все больше окрестных домов и просто прохожих подпадают под влияние зеленой красавицы. И постепенно елка, возносясь к холодному декабрьскому небу аж на 35 метров, становится средоточием всех наших рождественских и новогодних желаний, ожиданий и устремлений.

На предприятии «Горсвет» нас заверили, что «витебляне по достоинству оценят световое облачение новогодней ели», так как в этом году елка зажжется исключительно энергосберегающими огнями (будут использоваться только светодиодные лампы). А значит, отметили в «Горсвете», она будет более яркая, но при этом «кушать» электричества будет в три-четыре раза меньше. Правда, на сколько конкретно киловатт тянет новогодняя красавица, не сообщили: «Это надо подсчитывать еще, не до этого».

По предварительной информации, елка на площади Победы в первый раз засияет огнями 19 декабря. Но главное зажжение и торжественное открытие произойдет накануне рождественской ночи – 24 декабря. Что это будет за действо – пока неизвестно.

Но точно известно, что 24 декабря пройдет традиционный парад Дедов Морозов и Снегурочек. Новогодние персонажи пройдут от площади Свободы к главной елке города. Режиссура праздника разрабатывается в центре культуры «Витебск» и держится в тайне. Ждем сюрпризов и рождественских чудес!

Кастусь ПАЛАНЕЦ

К новогоднему празднику в этот раз в Витебске загорится самая высокая в истории города ёлка. Её высота - целых 35 метров. Зелёная красавица на 10 метров выше своих предшественниц.

По словам проектировщиков, занимавшихся реконструкцией площади Победы, высота устанавливаемой здесь новогодней елки может достигать и 45 метров.

Правда, до рекордов Книги Гиннесса даже ей будет далеко. Там прочно прописались рекордсменки из Вашингтона - 67 метров, Варшавы - 72 метра и Рио-де-Жанейро - свыше 80 метров.

А вот перегнать главные елки России, Украины и родной Беларуси ей будет несложно. В Москве высота елки - около 33 метров, в Киеве и Минске - около 35 метров.

ТЕМА НОМЕРА

Почему люди уезжают из родной страны

18 декабря ООН отмечает Международный день мигранта – переселенца

В этот день в 1990 году Генеральная Ассамблея ООН приняла Международную конвенцию о защите прав всех трудящихся-мигрантов и членов их семей.

В своей резолюции ООН предложила не только правительствам государств, но и общественным организациям, а также простым гражданам уделить внимание этой сложной проблеме.

Генеральный секретарь ООН в своих посланиях к нам, пока еще никуда не мигрирующим, постоянно призывает все государства присоединиться к конвенции о защите прав этой категории людей. Мотивирует он это тем, что мировая экономика всё больше зависит от мигрантов и общество без них обеднеет.

Если для США и большинства западноевропейских государств наиболее актуальны вопросы иммиграции – въезда в страну бывших граждан из разных уголков мира, то Беларусь на сегодняшний день больше волнует эмиграция – «утечка мозгов и рабочих рук». Ведь в поисках «лучшей доли» пределы республики навсегда покидают, чаще всего, самые активные и талантливые, не нашедшие применения своим способностям на Родине. К сожалению, существует у нас и так называемая политическая эмиграция, когда люди вынуждены уезжать из-за угрозы своей свободе, безопасности, а то и жизни.

Сегодня у нас в гостях те, без кого наше общество действительно обеднело или может обеднеть.

“Жыць трэба дома”

Сяргей Навумчык – скончыў віцебскую школу № 28 і журфак БДУ. Працаваў у “Віцебскім рабочым”, пісаў на тэмы рэстаўрацыі архітэктурных помнікаў і экалогіі. Уваходзіў у клуб “Узгор’е” і ініцыятыўную групу супраць будаўніцтва Віцебскай АЭС.

У 1990-1996 – дэпутат Вярхоўнага Савета БССР-РБ 12-га склікання, адзін з распрацоўшчыкаў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. З сакавіка 1996 – у палітычнай эміграцыі. Першы намеснік Старшыні Рады БНР, супрацоўнік беларускай службы радыё “Свабода”.

Выехаў я з Беларусі ў Кіеў праз адкрытую беларуска-расійскую мяжу ў сакавіку 1996 года, калі па тэлебачанні пракурор Менску заявіў пра крымінальную справу за арганізацыю шматтысячнага мітынгу.

Праз тры дні па маім маршруце вывезлі Пазьняка. У рэальнасць пагрозаў паверыў, калі генпракурор Беларусі звярнуўся ў пракуратуру Украіны з патрабаваннем нас выдаць, а тая адмовіла: “палітыкаў не выдаем”. Але палітпрытулак мы папрасілі толькі тады, калі ўжо ў ЗША атрымалі інфармацыю, што арышт – ня горшае, што нам пагражае.

З таго часу я чуў папрокі рознага кшталту – што не трэба было з’язджаць, а варта было сесці ў турму...

Заканчэнне на стар. 6

В наш город 19 декабря прибывает Вифлеемский Огонь

Торжественная служба состоится в Свято-Успенском храме.

Уже в шестой раз, благодаря скаутам «Христианского содружества взрослых и молодых», в Витебск будет привезён, в рамках традиционной ежегодной международной скаутской акции «Вифлеемский Огонь мира и дружбы», огонь от Негасимой лампады в Базилике Рождества Христова в Вифлееме.

Вифлеемский Огонь мира и дружбы – международная акция скаутов Европы и Беларуси. Как по своеобразной эстафете, Огонь, зажжённый от лампады над местом, где родился Иисус Христос, переносят по всей Европе в специальных лампах. Уже более 20 лет Вифлеемский Огонь передаётся из рук в руки, из храма в храм, из скаутской штаб-квартиры к домашним лампадкам верующих. В Беларуси акция проводится уже десятый год.

В этом году Вифлеемский Огонь вновь прибудет в Беларусь, чтобы донести до всех верующих свет Рождества Христова.

«Акция «Вифлеемский Огонь», благодаря организации «ХСВМ», ежегодно охватывает все большее количество регионов Беларуси. Этому также содействуют партнёры Христианского содружества – «Белорусское харцерство» и «Белорусская Республиканская скаутская ассоциация». Координатор акции по Беларуси – скаут-инструктор Алексей Дозорцев.

Традиционно ключевыми моментами акции являются службы в Гродно, Минске и Витебске. Наш город является местом передачи Огня скаутам из России.

Акция проходит при поддержке Белорусской православной и Римо-католической церквей.

Торжественный молебен по встрече Огня в Витебске состоится 19 декабря в 17.00 в Свято-Успенском храме.

Стефан ВИЛЬЧИНСКИЙ

Парад Дедов Морозов и Снегурочек в Витебске

В канун католического Рождества в Витебске пройдёт парад Дедов Морозов и Снегурочек.

Второй год подряд в культурной столице Беларуси состоится праздничное шествие «красноносых и белобородых». 24 декабря все Деды Морозы и Снегурочки Витебска соберутся на площади Свободы и отправятся к новому центру города, на площадь Победы, где находится главная елка города, залит каток, установлены аттракционы.

Апогеем вечера станет церемония зажжения главной городской елки, всех гостей праздника ожидает масса веселья и сюрпризов.

Проведения данного мероприятия становится хорошей традицией не только для северной столицы, но и для других регионов республики. В прошлом году подобный парад прошёл в ряде крупных городов Беларуси. Витебск в этом ряду был первым и, возможно, самым красочным, десятки «Дедов и внучек» шагали по главной улице города, а на одном из перекрестков Дед Мороз регулировал движение автотранспорта. Шествие сего года обещает стать ещё более массовым и ярким.

Алексей ДОВГАЛОВ

«Послушай-ка»

В Полоцке начинается второй этап реализации проекта помощи слабослышащим людям «Послушай-ка».

Благодаря визиту в Полоцк делегации из города-побратима Фридрихсхафена, были достигнуты договоренности по реализации второго этапа проекта помощи слабослышащим людям «Послушай-ка».

Бюджет проекта составит более 65 тысяч евро. Данный проект был инициирован сопредседателем немецкого общества «Круг друзей» Ротраут Биндер. Ее семья приобрела прибор для определения степени тугоухости стоимостью в 3 тысячи евро.

Позже к проекту подключились жители Фридрихсхафена, которые собрали 45 тысяч евро. Все деньги пошли на закупку специального оборудования для слабослышащих детей Полоцка и Полоцкого района.

Следующий этап проекта «Послушай-ка» получил финансирование в рамках программы поддержки Беларуси Федеральным министерством экономического сотрудничества Германии. Данная программа нацелена на оказание помощи всему слабослышащему населению региона. Также планируется провести разъяснительную работу о вреде громкой музыки и постоянного использования плееров.

Юрий ЛЯХ

БХД накіроўвае ў суд зыск супраць БТ

Сустаршыня БХД Павел Севярынец

Лідэры партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя», якой на мінулым тыдні Мінюст у другі раз адмовіў у дзяржаўнай рэгістрацыі, намераныя бліжэйшым часам накіраваць яшчэ адзін зыск супраць Першага канала дзяржаўнага тэлебачання. Пра гэта прэс-службе ГА «БАЖ» паведаміў сустаршыня БХД, сябра рады БАЖ Павел Севярынец.

Паводле яго слоў, зыск будзе пададзены ад імя сустаршыні БХД Георгія Дзмітрука. «13 снежня ў эфіры Першага канала дзесяць хвілін ліліся бруд і паклёп на «Беларускую хрысціянскую дэмакратыю», – лічыць Павел Севярынец. – Паклёпніцкія факты, паказаныя на тэлеканале, «высмактаныя з пальца». Распаўсюд падробленых нібыта перамоваў Георгія Дзмітрука ўвогуле з'яўляецца крымінальнай справай, бо ў эфір выдаюцца неправераныя факты, якія дыскрэдытуюць чалавека».

У сваёй скарзе ў суд Георгій Дзмітрук згадае не толькі выпадак, звязаны з ім асабіста, але і ўсе факты знявагі і паклёпу на БХД, якія, на думку лідэраў партыі, мелі месца ў праграмах беларускага дзяржаўнага тэлебачання 13 снежня і раней.

Нагадаем, што зараз у судзе Першамайскага раёна Мінска ўжо знаходзіцца зыск БХД аб абароне гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі супраць Нацыянальнай дзяржтэлерадыёкампаніі. Тады нагодай судовай скаргі сталі сюжэты пра арганізацыю і яе лідэраў, паказаныя на Першым тэлеканале ў праграме «Панарама» 27 і 28 верасня гэтага года.

Служба маніторынгу ГА "БАЖ"

Автобусов в Витебске станет меньше

Около 8 процентов автотранспорта не выйдет в рейс. Транспортники утверждают, что причин для беспокойства нет.

В Витебске отменено более 100 автобусных рейсов. Водителей автобусов перевели на сокращенный график работы. Уменьшение количества рейсов коснется только городского транспорта.

Как отметил заместитель директора по экономическим вопросам Автопарка №1 Петр Малевич, «сокращение связано с непростым финансовым положением на предприятии. В этом году субсидии из городского и областного бюджетов сократили на полтора миллиарда рублей».

Пока уменьшение количества маршрутов не предусмотрено. Кроме того, специалист заверил, что в часы-пик транспорт будет работать по прежнему графику. По словам Петра Малевича, «эта мера временная» и к началу следующего года будет восстановлен нормальный режим работы.



Юрий ЛЯХ

Улицы Витебска без металлолома

Брошенные авто, что частенько захламляют дворы домов и улицы нашего города, больше не будут красоваться на старых местах.

Уже более трехсот владельцев брошенного автохлама получили уведомления от экологического надзора ГАИ. У обладателей таких авто есть несколько способов защитить себя от проблем: привести автомобиль в порядок, переместить машину в гараж или на платную автостоянку или сдать на металлолом.

Данные меры уже дали результат: большинство автомобилей уведомлённых владельцев исчезли со старых мест. Траспортные средства, которые остались стоять, как прежде, во дворах и вдоль обочин, будут перемещены на охраняемую территорию КПУП «Специализированное ремонтно-строительное управление г. Витебска», откуда владельцы их смогут забрать лишь на стоянку, в гараж либо для сдачи на металлолом.

Алексей ДОВГАЛОВ

«Душа Сербии» в Витебске

С 12 декабря в Витебском духовном училище проходит благотворительная фотовыставка «Душа Сербии» фотографа Дарко Дозета.

В экспозиции – 44 фотографии, которые разметились в овальном зале училища. На фото – жизнь людей в анклавах-гетто, разрушенные монастыри, дома, оскверненные надгробия и иконы.

На церемонии открытия был показан фильм «Распятое Косово», рассказавший о противостоянии в этой бывшей албанской автономии в составе Сербии, а сейчас признанном большинством стран мира суверенном государстве.

Данное мероприятие – первая часть благотворительного проекта, организатором которого является культурно-просветительское учреждение «Сербский центр». Во время благотворительной акции все желающие могут помочь жителям Косово и Метохии. Пожертвования будут перечислены на счет гуманитарной организации «Срби за Србе» («Сербы за сербов»). На собранные деньги ее представители приобретут вещи и продукты, необходимые для выживания сербов в анклавах-гетто.

Фотовыставка в Витебске будет работать до 11 января ежедневно с 10.00 до 17.00. Вход свободный.

Кроме того, 26 декабря в Витебске состоится мероприятие, посвященное памяти Патриарха Сербского Павла, который скончался 15 ноября 2009 года. В этот день в храме Витебского духовного училища будет отслужена панихида о почившем предстоятеле, после чего пройдет премьера документальной ленты «Ангел Сербской церкви», рассказывающей о малоизвестных фактах биографии владыки.

По информации прес-службы «Сербского центра»

Стефан ВИЛЬЧИНСКИЙ

Неўскі над Дзвіной?

У Віцебску падумваюць паставіць помнік Аляксандру Неўскаму

Абмеркаванне праектаў, якія, па задумцы аўтараў, павінны былі б больш фактурна абазначыць слаўную мінуўшчыну Віцебска, зрабіліся апошнім часам традыцыяй. Некаторыя з іх ажыццявіліся (герб вобласці), некаторыя вось-вось саспеюць (помнік княгіне Вользе), а некаторыя ўжо на этапе эскізаў выклікаюць неразуменне і крытыку, як у выпадку з праектам помніка рускаму князю Аляксандру Неўскаму (1220-1263).

Пытанняў сапраўды шмат. Ці наш гэта нацыянальны герой, каб ставіць яму помнік у Віцебску? Якую ідэалагічную нагрузку будзе несці манумент гэтаму дзеячу? Ці наогул варты Аляксандр Неўскі як гістарычная асоба помніка? Такія пытанні агучваюцца і на інтэрнэт-форумах, і ў зале Музычнай гасцёўні, дзе выстаўлены эскізныя праекты.

Пры гэтым хтосьці нашэптвае пра лабіраванне інтарэсаў праваслаўнай царквы, хтосьці бачыць у гэтым "падкопы расійскага імперыялізму", а камусьці ўсё адно – абы ў горадзе быў конны помнік якому палкаводцу...

Супярэчная постаць

Аляксандр Яраслававіч – супярэчлівая асоба не толькі ў беларускім кантэксце, але й для расійскай гісторыі. З аднаго боку, ён пераможца шведаў (Неўская бітва, 1240) і Тэўтонскіх рыцараў (Лядовае пабоішча, 1242). З другога – прыёмны сын хана Батыя, які канчаткова аформіў саюз Русі і Залатой Арды і які пасля гэтага выкарыстоўваў татарскую конніцу ў барацьбе за ўладу супроць рускіх князёў (у тым ліку супраць роднага брата Андрэя).

Жорсткі быў князь. Але ў выніку стаў святым (Аляксандр Неўскі кананізаваны ў 1547 годзе на царкоўным саборы, скліканым мітрапалітам Макарыем і царом Іванам Жахлівым), бо "захаваў цэласнасць праваслаўя" – у вырашальны момант адмовіўся ад прапановы Папы Рымскага перайсці ў каталіцтва.

Віцебск і Неўскі – адны легенды?

Але пры чым тут Віцебск? Насамрэч, гістарычныя сувязі сапраўды існуюць. Пра тое, што наўгародскі князь наведаў наш горад у 1245 годзе, паведамляюць рускія летапісы. Князь прыязджаў, каб забраць з горада свайго сына («в лето 6753 сам поима сына своего из Витебьска, поеха в мале дружие..."), які гасціў тут у сваёй бабулі – жонкі Полацкага князя Брачыслава. Як вядома, жонкай самога Неўскага была княжна Аляксандра (Параскева), дачка князя Брачыслава, з якой, паводле легенды, ён быў павенчаны ў Віцебску. Але ці гэта так?

Яшчэ ў 1992 годзе вядомы віцебскі краязнаўца і журналіст Аркадзь Падліпскі апублікаваў артыкул "Александр Невский в Витебске не венчался", у якім ён развянчаў міф пра вянчанне Неўскага ў нашым горадзе.

Гісторык цытуе ў артыкуле кнігу В. Пашуты "Александр Невский" (серыя ЖЗЛ), у якой знаўца рускага сярэднявечча гэтак апісвае падзею: «Венчание состоялось в Тороповце (цяпер горад Тарапец, раённы цэнтр Цвярской вобласці – К.П.), в храме святого Георгия. Венчал смоленский епископ. Тут молодожены ели «брачную кашу» – давали праздничное угощение. Это была свадьба военных лет в готовой к бою небольшой крепости. В Тороповце присутствовала родня, соратники и, конечно, суздальские, смоленские, полоцкие князья».

Зразумела, што аўтар кнігі мог памыліцца, адзначае Падліпскі, аднак аргументаў на карысць віцебскай версіі няма ні ў водным з вядомых гістарычных дакументаў. Дык адкуль жа ўзялася гэтая легенда?

Адзін з эскізаў помніка Аляксандру Неўскаму
ФОТО: АЛЕНЫ РУДЗЬ

Аркадзь Падліпскі распавядае, што яна пайшла гуляць з лёгкай рукі экскурсавода Г. (цяпер нябожчыка), фантазёра і выдумшчыка, які з канца 60-х гадоў мінулага стагоддзя працаваў у віцебскім бюро вандровак і экскурсій. Першакрыніцай сваёй абазнанасці ў пытанні вянчання наўгародскага князя Г. назваў ліст Сяргея Міхалкова, галоўнага рэдактара кінажурнала "Фіціль". Міхалкоў нібыта і паведаміў яму "факт" вянчання ў Віцебску.

Толькі праз паўгады, пасля настойлівых просьбаў паказаць гэты ліст, Г. прызнаўся Падліпскаму ў фальсіфікацыі. Усё было ўзята з галавы, каб экскурсіі былі цікавейшыя. Але легенда ўжо пайшла ў тыраж і трапіла ў прэсу. "Самае непрыемнае, што яна дагэтуль жывая", – кажа Аркадзь Падліпскі, называючы яе казкай і падманкай.

Паўстае пытанне: калі Неўскі сапраўды тут не вянчаўся, дык ці варта ставіць яму помнік толькі за тое, што ўзяў у жонкі полацкую княжну ды прыехаў адзін раз у Віцебск за сынам?

Пафасная фантазія

Наогул жа падобна на тое, што вобраз дабраверпага князя не вельмі натхняе на творчыя ўзлёты і беларускіх скульптараў, якія прэзентуюць эскізныя праекты помніка ў Музычнай гасцёўні. На выставе, дзе прадстаўлены 11 варыянтаў планаванага помніка, пануе занадта ўжо пафасная атмасфера, а ад некаторых праектаў яўна патыхае цвіллю. Чаго вартая, напрыклад, "тлумачальная запіска" да аднаго з іх: "...взгляд князя устремлен в сторону извечных врагов народа русского – на Запад". Пры гэтым сам праект называецца "Защитник Отечества".

Адзін з аўтараў прапануе ўсталяваць свайго Аляксандра Неўскага (пастамент з чырвонага граніту) на Плошчы Перамогі "как напоминание к потомкам о победе Великого нашего народа и Великого мудрого полководца..." и г.д. Цікава, які "вялікі народ" тут маецца на ўвазе.

Але самым папулярным у нашых скульптараў апынуўся сюжэт "Аляксандр Неўскі з сынам". Адзін з аўтараў тлумачыць змест кампазіцыі тым, што хацеў паказаць князя Аляксандра Неўскага "не только как воина, полководца, но и как семьянина – мужа, отца, что является особенно актуальным на современном этапе нашей жизни..."

Трапіў у яблычка творца: як ні круці, а вобраз бацькі (тым больш Аляксандра) з малалетнім сынам сапраўды з'яўляецца на сённяшні дзень "особенно актуальным". Але ж ці падстава гэта, каб выліваць фігурную кампазіцыю такога зместу ў бронзе на віцебскай плошчы Тысячагоддзя? Пытанне пакуль што адкрытае...

Кастусь ПАЛАНЕЦ

Новые памятники в Витебской области

ПОЛОЦК

• Памятник торговым весам. Установлен у магазина «Фридрихсхавн» в микрорайоне «Аэропорт».

• Памятник «Полоцкий купец». Район «Дома Торговли», недалеко от рынка.

• Всеславу Чародею. Пересечение улиц Евфросиньи Полоцкой и Октябрьской.

• Андрею Полоцкому. Он был фактически витебским князем, но из-за политических разногласий с отцом сбежал в Московию, затем вернулся и погиб как герой в битве с татарами.

• Симеону Полоцкому. Находится на проспекте К.Маркса, около кинотеатра «Родина».

• Белорусской букве «Ў». Находится в сквере на проспекте К.Маркса.

• памятный знак «Географический центр Европы». Открыт 31 мая 2008 года.

НОВОПОЛОЦК

• Памятник сантехнику и дворнику. Деревянные скульптуры в в одном из дворов по улице Парковой.

ВИТЕБСК

• витебскому трамваю. 5-я улица Фрунзе, на территории трамвайного депо.

• Иоанну Павлу II. Ул. Воинов-интернационалистов, возле строящегося здания культурно-религиозного центра, принадлежащего приходу Иисуса Милосердного Витебской епархии Римско-католической церкви в Беларуси.

• памятник узникам еврейского гетто (планируется). Проект разрабатывает лауреат Ленинской премии за мемориальный комплекс «Хатынь» Леонид Левин.

ПОСТАВЫ

• Памятник белорусскому орнитологу Константину Тизенгаузу.

Узнать свой край

Кто-то проводит выходные у телевизора, кто-то оттягивается на дискотеках, кому-то по душе «булькающий друг» в заплеванном подъезде... А вот новополоцкие молодые активисты «Нашего Дома» решили получше узнать свой край. 12 декабря они отправились в путешествие по деревням и местечкам региона, чтобы увидеть их достопримечательности.

В поездке принимало участие восемь человек. Были осмотрены наиболее интересные объекты архитектуры шести населённых пунктов: оригинальный усадебный дом помещика Гласка и Вознесенская церковь в Россонах, усадьба Шадурских и парк с «кратерами» в Освее, один из самых красивых костелов в Европе, а теперь Успенская церковь в Сарье и там же усадьба Лопатинских, Троицкий костёл и церковь в Росице, костел Рождества Девы Марии и церковь св. Николая в Верхнедвинске, костел Преображения Господнего в Германовичах.

Предварительно каждый участник экскурсии выбрал населённый пункт, о примечательных местах которого приготовил небольшой рассказ.

В результате поездки молодые люди ознакомились с красотами нашего края, научились не только смотреть и слушать, но и самими быть своеобразными гидами. для остальных. А на память остались десятки фотографий красивейших архитектурных памятников нашей области.

Ирина ПЕТРОВА

«ВИТЕБСКОМУ КУРЬЕРУ» ТРЕБУЮТСЯ

РАСПРОСТРАНИТЕЛИ (ОГРАНИЧЕННОЕ КОЛИЧЕСТВО)

И ВЕРСТАЛЬЩИКИ (НЕОГРАНИЧЕННОЕ)

ТЕЛ. В РБ +375 29 217 06 92
ТЕЛ. В РФ +7 905 555 66 63

ПОГЛЯД ЛЯВОНА БАРШЧЭЎСКАГА

Адказнасць за будучыню

Прыгадваю адзін эпізод з першай паловы 90-х гадоў, часу, калі мне давялося быць дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі. У зале пасяджэнняў ішла дыскусія пра ратыфікацыю чарговага пагаднення з Расіяй – здаецца, у палітычнай сферы. Як заўсёды, мы, апазіцыйная меншасць, працавалі ў кулуарах, тлумачачы дэпутатам ад наменклатуры бесперспектыўнасць будучыні Беларусі, калі мы будзем ва ўсіх сферах толькі плесціся ў хвасце нашага ўсходняга суседа.

І вось падчас размовы з Міхаілам В., адным з раённых кіраўнікоў Віцебскай вобласці, гэты самы кіраўнік, колішні выпускнік Беларускай сельгасакадэміі і ВПШ, не хаваючы раздражнення і амаль зрываючыся на крык, кінуў нам: "Ды што мы без Расіі? Мы падохнем з голаду!"



Лявон Баршчэўскі
ФОТО: PHOTO.BYMEDIA.NET

Што ж мы без Расіі?

Пасля таго дыялогу прайшло больш як пятнаццаць гадоў. Тым не менш, калі пачаць размову на падобную тэматыку з якім-небудзь кіраўніком беларускага буйнога прадпрыемства, у шмат якіх выпадках пачуеш той самы адказ, што мы тады пачулі ад Міхаіла В.

Прычым сваёй верай у расійскую "чароўную палачку" вызначаюцца не толькі гаспадарчыя кіраўнікі старэйшага пакалення, выхаваныя за савецкім часам, але нярэдка і тыя, хто набыў менеджэрскую кваліфікацыю ўжо ў часы незалежнай Беларусі. Гэтыя кіраўнікі шчыра і наіўна вераць, што галоўны рэсурс канкурэнтназдольнасці беларускай прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі – гэта танныя сыравіна і энерганосьбіты, і, галоўнае, што гэтыя сыравіна і энерганосьбіты мусяць і павінны быць таннымі аж да другога прышэсця Хрыстовага.

Польская рэчаіснасць

Дарэчы прывесці паралелі з сітуацыяй, якая сёння рэальна назіраецца ў нашага найбліжэйшага заходняга суседа – Польшчы. Сёлета польская эканоміка, нягледзячы на сусветны эканамічны крызіс, захавала станоўчую дынаміку гаспадарчага росту. У першых двух кварталах гэтага года рост валавага ўнутранага прадукту склаў там каля 1%, што было найвышэйшым узроўнем развіцця ў Еўропе і, фактычна, адным з самых высокіх у свеце.

За перыяд жа са студзеня па верасень 2009 г., згодна з прагнозам Міжнароднага валютнага фонду, прырост польскага ВУП павінен скласці не менш, як 1,2%. Заўважу, што гэта прытым, што польскія прадпрыемствы яшчэ з сярэдзіны 1990-х гадоў купляюць сыравіну і энерганосьбіты па сусветных коштах, не маюць ніякіх ільготаў ці "роўнадамоўных цэнаў" ні ад Расійскай Федэрацыі, ні ад Нарвегіі, ні ад іншых, менш значных краін-пастаўшчыкоў.

Пасля ж уступлення ў Еўрапейскі Саюз у 2004 годзе, абарот знешняга гандлю Польшчы штогод павышаўся ў сярэднім амаль што на 19 працэнтаў (!). Той, хто меў магчымасць пабываць у гэты час у суседняй краіне, мог пераканацца, як рэальна ўзрос дабрабыт звычайных палякаў.

Прыгэтымкоштпрадуктаў харчавання і іншых тавараў у польскіх крамах у сярэднім на 15-20% ніжэйшы за беларускія. Я, напрыклад, ужо тры гады хаджу ўзімку ў куртцы, якую набыў у польскім гіпермаркеце за кошт, эквівалентны 20 доларам ЗША. Прыгадваю таксама, як не раз набываў там упакоўкі якасных шкарпэтак коштам прыкладна па 2 долары за 5 параў... Дома ў нас стаіць партатыўны тэлевізар польскай вытворчасці з плоскім экранам коштам каля 200 долараў, а да яго далучаны куплены таксама ў Польшчы прайгравальнік DVD коштам... не паверыце – каля 65 тысяч беларускіх рублёў (у эквіваленце).

А што ў Расіі?

Ну, але хваліць Польшчу і палякаў – справа ў нашай сінявокай Беларусі не надта папулярная, таму я на гэтым прыпынюся, а скірую свой погляд у бок Расіі, з якой беларускімі ўладамі створаны шчыльны ваенны саюз, а на паперы – таксама Саюзная дзяржава і Мытны саюз (цяпер яшчэ і ў "траістым" фармаце – разам з Казахстанам).

Дык вось, у Расіі, на жаль, прамысловы спад за апошні год склаў каля 13 працэнтаў, агромністыя прадпрыемствы кшталту ВАЗа фактычна збанкрутавалі, і нездарма расійскі ўрад "упіхвае" давалі сваім акцыянерам хоць які прыбытак, просяць і просяць ва ўрада дзяржаўнай падтрымкі.

Гэта прытым, што Расія ўвязалася ў вельмі дарагі праект – правядзенне зімовай Алімпіяды ў Сочы, прытым, што шматтысячакіламетровая вонкавая мяжа і многанацыянальны характар гэтай дзяржавы патрабуе ўтрымання і пастаяннага тэхнічнага пераўзбраення велізарных узброеных сіл і сіл правапарадку. Акрамя таго, аграмадныя сродкі паглынаюць дзяржапарат і сумнеўнага кшталту структуры (органы СНД, Калектыўнай бяспекі, ЕўрАзЭС, Шанхайскай дамовы і да т. п.).

На сёння прадпрыемствы ваенна-прамысловага комплекса фінансуюцца з расійскага дзяржаўнага бюджэту ў прыярытэтным парадку, а, як вядома, гэтыя страты для звычайных грамадзян нічым не кампенсуюцца.

Нягледзячы на тое, што сярэднія памеры пенсій у Расійскай Федэрацыі сёння вышэйшыя, чым у Беларусі, але гэтая "сярэдняя" велічыня складаецца з высокіх сваімі памерамі пенсій для мільёнаў былых чыноўнікаў, генералі-тэту і вышэйшага афіцэр-ства ўзброеных сіл і спецслужбаў. У той час, як для большасці расійскіх пенсіянераў стандартны памер пенсіі складае штомесяц прыблізна 3 тысячы расійскіх рублёў (каля 100 долараў ЗША).

З гадамі беларуска-расійскія адносіны не змяняюцца.
На фота: прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў дарыць пісталет сыну прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі Коле.
ФОТА: LIVEJOURNAL.COM

Беларусі адзіныя мытныя пошліны на ўвозаўтамабіляў-іншамарак. Відавочны разлік на тое, што беларусы будуць вымушаныя – з прычыны недаступнасці іншамарак па новых коштах – купляць тыя самы "лады" і ратаваць працоўныя месцы на заводзе ў Тальяці.

Як паказалі тэлефа-наванні прэм'еру Уладзіміру Пуцінупадчас яго нядаўняй прамой лініі, і КамАЗ, і вагонабудаўнічыя, і станкабудаўнічыя прадпрыемствы, і сельгасвытворцы знаходзяцца ў не менш лепшым стане. Прадпрыемствы, якія раней

У разліках на генеральскія пенсіі…

Не сакрэт, што многія нашы высокія чыноўнікі, генералы, кіраўнікі буйных прадпрыемстваў хацелі б інтэгравацца з Расіяй "аж да зліцця ў экстазе" – толькі экстаз гэты не мае нічога агульнага з беларускімі нацыянальнымі інтарэсамі, а грунтуецца на – зрэшты, наіўным – разліку гэтых асобаў некалі ў будучым атрымаць пенсію расійскага высокага дзяржслужбоўца або генерала.

Узгадваю зноў-такі пачатак 90-х гадоў, калі пасля распаду СССР многія капітаны і маёры былога савецкага войска на працягу аднаго-двух гадоў зрабіліся палкоўнікамі і генераламі беларускіх Узброеных Сіл, і сёй-той з іх вырашыў памяняць грамадзянства і адправіцца на службу ў расійскую армію. Дык вось там ім сказалі, што мы вашых беларускіх вайсковых званняў не прызнаём і возьмем вас на службу толькі капітанамі або маёрамі.

Разумею, што некаторыя з нашых высокіх гаспадарчых кіраўнікоў разлічваюць вытвараць зброю і рыштунак для расійскай арміі і спецслужбаў і атрымоўваць пад гэта гарантаваны дзяржзаказ ад... расійскага ўраду. Толькі ім чамусьці няўцям, што сама наяўнасць у іх нерасійскага пашпарта, а значыць, адсутнасць вызначаных законам абавязацельстваў абараняцьінтарэсы менавіта Расійскай Федэрацыі, не можа ўраўняць іх і ўзначальваныя імі прадпрыемствы з адпаведнымі прадпрыемствамі, што знаходзяцца пад кантролем урада Расіі (прадпрыемствы ВПК па азначэнні не могуць быць ад урада незалежнымі).

Паводле вызначэння, геапалітычныя і вайсковыя прыярытэты невялікай і кампактнай Рэспублікі Беларусь, якая мае больш за тысячу кіламетраў агульнай мяжы з Еўрапейскім Саюзам і істотна меншую працягласць беларуска-расійскай мяжы, мусяць радыкальна разыходзіцца з адпаведнымі прыярытэтамі еўраазіяцкай Расійскай Федэрацыі. Таму расійскія абаронныя заказы ў Беларусь могуць паступаць у вельмі абмежаваных памерах – і тое толькі ў выпадках, калі гаворка ідзе пра вытворчасць элементаў узбраення і спецтэхнікі.

Глыбокая інтэграцыя

Відавочна, што пытанне падтрымкі беларускіх прадпрыемстваў, якія хочуць працаваць на расійскі ВПК, выключна палітычнае. Увогуле, Беларусь мае такога ўсходняга партнёра, які не можа абысціся таксама без палітызацыі фактычна ўсяго комплекса эканамічных адносін абедзвюх дзяржаў. Уладзімір Пуцін падчас той самай прамой лініі выказаўся гранічна ясна: "Чым глыбейшая інтэграцыя [ў межах Саюзнай дзяржавы], тым больш магчымасцяў пераходзіць на ўнутрырасійскія кошты і стандарты па энерганосьбітах" .

Заўважце, аднак, што кіраўнік расійскага ўрада не гаворыць наўпрост, што Беларусь рэальна будзе атрымліваць энерганосьбіты па ўнутрырасійскіх коштах, а абыходзіцца эўфемізмам: "больш магчымасцяў...

Між тым, расійскія эксперты даўно вызначылі шлях, паводле якога гэтыя самыя "ўнутрырасійскія кошты" цягам бліжэйшых гадоў будуць ураўноўвацца з сусветнымі. І гэта не прыхамаць гэтых экспертаў, а неабходная ўмова для інтэграцыі Расіі ў сусветную эканамічную сістэму, у тым ліку для ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

Завязаная на сыравінныя галіны расійская эканоміка можа ў найбліжэйшай перспектыве выжыць, толькі атрымоўваючы за сваю сыравіну і энерганосьбіты "жывыя грошы" ад краін Захаду і Кітая. І пераход на сусветныя кошты для сваіх прадпрыемстваў непазбежны, а значыць, беларускім прадпрыемствам ніякія "асаблівыя" ці "роўнадамоўныя" кошты папросту не свецяць.

За страту суверэнітэту наша краіна заплаціць два разы – падпарадкуецца імперскай палітыцы ўсходняга суседа і страціць сваю эканоміку, магчымасці праз неабходныя рэформы зрабіцца канкурэнтназдатнай у атачэнні блізкіх сваёй структурай Украіны, Польшчы, балтыйскіх дзяржаў. Але самае галоўнае: за гэта заплацяць мільёны нашых суграмадзян, ператварыўшыся ў малааплатную абслугу чужых геапалітычных амбіцый.

Што рабіць у гэтых умовах? Адказ можа быць адзін – пачаць сістэмныя рэформы эканомікі (а значыць, і палітычнай сістэмы), зрабіць стаўку на інтэграцыю з сусветнай эканомікай. Пытанне, ці здольнае на гэта пайсці сённяшняе беларускае палітычна кіраўніцтва, выглядае абсалютна рытарычным...

Лявон БАРШЧЭЎСКІ.

РАССЛЕДОВАНИЯ НИКОЛАЯ ПЕТРУШЕНКО

Военные тайны панской усадьбы в Голошево



Члены кружка юных читателей библиотеки посёлка Коханово ежегодно совершают туристические экспедиции по памятным местам Толочинщины, и на этот раз они посетили деревню Голошево. Здесь, на берегу озера Голошевское, у стен заброшенной панской усадьбы, они услышали от краеведа Николая Касьяна рассказ о том, как в далёком 1917 году местный помещик бежал на Запад...

Попробуем уточнить дату поспешного бегства и увидим, что она противоречит устоявшимся версиям о страхе помещика перед властью большевиков.

Дело в том, что на самом деле по своему статусу пан Дендевицкий (Дзюндзявіцкі) был не столько помещиком, сколько предпринимателем. Его фамилия правильно пишется Цюндзевицкий. Он – представитель известного польского рода, родился в поместье Кищина Слобода недалеко от города Борисова в 1866 году.

Михаил Цюндзевицкий в деревне Голошево появился в звании дипломированного инженера. Сюда его привлекла близость к железной дороге, обилие леса и тихая гладь озера, где, по слухам, Наполеон приказал затопить часть награбленного в Москве золота.

Здесь в сотрудничестве с партнерами по бизнесу он быстро развернул лесопильное производство, завел конный завод, смолокурню, организовал производство спирта и устроил на основе сапропелей местного озера «санаторий – грязелечебницу».

В кавычки я беру это коммерческое предприятие потому, что истинное предназначение его было в другом. Михаил Цюндзевицкий пошёл по стопам своего дяди – революционера, патриота Польши – и примкнул к основанной в 1893 году Польской социалистической партии. На территориях, аннексированных Россией, её возглавлял Юзеф Пилсудский.

К этому времени был создан и ряд подпольных подразделений, в том числе и основанная по инициативе Ю. Пилсудского Польская организация войсковая. Главной её целью было, как подчёркивается в «Очерках истории Польского Государства и народа» (Варшава, 2005 г.) подготовка кадров для польских воинских частей на территории России.

Ячейки ПОВ действовали в Литве, Беларуси, Украине, России... Польские, российские и белорусские историки стыдливо умалчивают о разведывательно-диверсионной деятельности этой организации. Так что, на самом деле, любовь помещика Цюндзевицкого к породистым лошадям и кавалерийским скачкам была подчинена далеко не спортивным целям.

А нынешние остатки лошадиной фермы в Голошево 90- лет назад должны были интересовать Генеральный штаб царской России больше, чем они привлекают ныне внимание краеведов.

В деревню Голошево, в поместье пана, в конце 1916 года приходили известия о решении императоров Вильгельма II и Франца Иосифа I о создании польской государственности на землях, аннексированных Россией и оккупированных в ходе неудачных для России боевых действий. Из поместья шли донесения о реакции польского населения на обещания царя Николая II «дать Польше автономию».

Усадьба, которая сейчас находится не в лучшем состоянии, могла бы открыть немало тайн
ФОТО: АВТОРА

По обе стороны фронта создавались польские военные формирования. Царь Николай II 25 декабря в приказе по армии и флоту успел объявить о создании объединённой Польши. Но через пару месяцев был вынужден отречься от престола.

В Голошево пришло известие про Декларацию Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов о праве Польши на независимость. Позже её подтвердило, но с ограничением, Временное Правительство, затем – Советы.

При Временном правительстве началось формирование 1-го Польского корпуса под командованием генерала Довбур-Мусницкого. Во что это вылилось для Беларуси, хорошо поведал Якуб Колас в своём произведении «Дрыгва». Легионеры, насевшие на деда Талаша, – это не только литературный образ. Это реальные польские солдаты из задуманной и реализованной комиссарами Временного правительства идеи формирования национальных частей.

На западе тоже всё шло примерно в этом направлении. 12 сентября в Варшаве была сформирована Регентская Рада, которая должна была организовать выборы польского короля.

Правительство Польши возглавил Ян Кухажевский, призыв которого к польской интеллигенции принять участие в создании национальной системы образования услышан был в Голошево и 50-летним инженером Михаилом Цюндзевицким. Считая свою миссию исчерпанной, «пан Дендзевицкий» поспешно уехал на запад... Вскоре в Голошево пришла и новая – советская власть.

Николай Касьян рассказал юным краеведам, как после оккупации Беларуси фашистами сын помещика приезжал в усадьбу отца, молча походил по деревне и так же тихо уехал...

Вот такие исторические и военные тайны хранит заброшенная панская усадьба.

Николай ПЕТРУШЕНКО, полковник запаса

НАШ ГІД СВЯТЛАНА БАРАНКОЎСКАЯ

Побач з сэрцам Еўропы

Першае пасяленне людзей на зямлі Шаркоўшчыны знойдзена ў в. Гарадзец, побач з Лужкамі, і датуецца VIII-IX ст.. У XIV стагоддзі Зяновіча надзяліў зямлёй князь Ягайла. У 1503 годзе па прапанове караля Зяновічы заснавалі маёнтак Шаркоўшчына.

Леў Сапега ў 1604 годзе набыў Іказнь, Друю, Пагост, Еды, Германавічы, Лужкі і Шаркоўшчыну.

Гэтая зямля так проста не адпускае ад сябе. І таму прапаную праехаць па вёсках ад Лужкоў да яшчэ аднаго геаграфічнага цэнтра Еўропы (адзін з іх знаходзіцца ў Полацку).

Ад знесенай сцяны з роспісам Драздовіча праедзем да помніка, які быў створаны ў 1996 годзе вядомым беларускім скульптарам Алесем Шатэрнікам падчас II Драздовіцкага пленеру. Зараз помнік з выяваю Пагоні каля вёскі Рубашкі выглядае нібы старажытны камень, на якім падчас падарожжаў адпачываў ці пісаў свае нататкі дзядзька Язэп.

Вялец і Вялес

І недалёка ўжо вёска Вялец. Назоў яе, хутчэй за ўсё, паходзіць з паганскіх часоў, калі шанавалі тут скоцяга бога Вялеса – апякуна багацця і ўрадлівасці.

У летапісах згадваюцца ігрышчы, на якіх "вадзіці тура". У хрысціянстве Вялес стаў святым Уласам, ахоўнікам хатняй жывёлы. Але дагэтуль захаваўся звычай у канцы жніва пакідаць у дар богу нязжатымі некалькі каласоў, якія называюць "воласавай бародкай". У музей народнага дойлідства і побыту пад Мінск з Вяльца перавезена Троіцкая драўляная царква XVIII ст.

Мнюты і іх уладальнікі

А дарога бяжыць уздоўж рэчкі Мнюта да вёскі Мнюта першая, з драўлянай сядзібай паноў Берастоўскіх і парэшткамі парку. Зашмат прадстаўнікоў гэтага роду сталі ўдзельнікамі паўстання 1831 году, цэнтрам якога на Беларусі былі Лужкі. Берастоўскіх збольшага лёс раскідаў па свеце пасля войнаў, паўстанняў, рэвалюцый ды рэпрэсій.

Авось Пяркоўскім, уладарам Мнюты Другой, пашчасціла менш. Іх драўляная сядзіба і зараз выкарыстоўваецца пад жытло. Захаваліся драўляныя пуня ды канюшня. З іхнага роду вядомы польскі кампазітар – Петра Пяркоўскі. Астатнія Пяркоўскія, у тым ліку і апошні гаспадар Мнюты, былі рэпрэсаваныя. І амаль каля кожнага другога іх прозвішча ў спісах варкуцінскіх, омскіх, томскіх лагераў – расстраляны… рэабілітаваны.

Выбітныя людзі

Адсюль бачны вялікі касцёл Панны Марыі у Задарожжы пабудовы 1910 г. З родавага маёнтку Якубенкі паходзяць бацькі вядомага рамантыка літаратуры Аляксандра Грынеўскага, якога ўвесь свет ведае пад псеўданімам Аляксандр Грын. Яго "Пунсовыя ветразі" родам адсюль, ад успамінаў і бацькоўскай тугі па радзіме.

Каля касцёлу пахаваныя яго цётка Надзея і дзядуля Яўсей, якія так і не дачакаліся дзетак, сасланых падчас паўстання 1831 году.

У гэтым жа храме быў ахрышчаны вядомы беларускі гісторык і таксама рамантык – Вацлаў Ластоўскі.

Недалёка, ў Забор'і, стаяла драўляная царква св. Мікалая. А ў Бушыках – Пакроўская царква XVIII ст.

Тут жа жыве сяброўка Драздовіча Ліна Пачопка, якой прысвячаў вершы паэт Міхаіл Машара. Яе мужа расстралялі бальшавікі. Дзякуючы ёй, музеі Беларусі ўзбагачаны захаванымі дыванамі і палотнамі мастака. Каб не яе ахвярнасць і адданасць, ніколі адмыслоўцы Луўра не адзначылі б веліч і адметнасць генія, які побач з Маркам Шагалам прадстаўляе Беларусь у энцыклапедыі "Сто лепшых мастакоў свету".

І ў канюшнях можна зрабіць палац

А калі з Лужкоў ехаць па другім шляху, то пабачым вёску Залессе. Канцом XIX – пачаткам XX ст. тут пазначаныя пабудовы драўлянага касцёлу, стараверскай царквы, сядзібы Моллі, гаспадарчыя пабудовы і парк. Дарэчы, касцёл быў, пакуль выкарыстоўваўся пад саўгасны амбар. Зараз знесены. Дом Моллі разабраны на цэглу.

Прыгажэйшыя мясціны, незвычайнай сілы гармонія прыроды і ансамблю пабудоў. Я ня ведаю, як жылі звычайныя шляхцічы на Беларусі, але архітэктурныя вартасці канюшні, пабудаванай ў стылі неаготыцы, годныя таго, каб сучасныя валадары жыцця ў ёй зрабілі палац. А парк абсталявалі пад нятаннае месца адпачынку.

След Лермантава

А Кашталянаўшчына, з сядзібай Быхаўцоў XIX-XX ст.ст. можа застацца ў памяці, дзякуючы сваім гаспадарам. У спадчыне расійскага паэта Міхаіла Лермантава захаваны ліст ад Кацярны Быхавец.

"Мы с ним так дружны были – он мне правнучатый брат – и… любила как родного брата. Так меня здесь и знали под именем charmante cousine Лермонтова… Уезжавши, он целует несколько раз мою руку и говорит: "Cousine, душенька, счастливее этого часа не будет больше в моей жизни. Я еще над ним смеялась… Это было в пять часов, а <в> восемь пришли сказать, что он убит".

